Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________ С.М. Ходзін
03.07.2018
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-4851/вуч.

# АНТЫЧНАЯ МЕТРЫКА І РЫТОРЫКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-21 05 05 Класічная філалогія

2017 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на падставе АСВА 1-21 05 05-2013, вучэбнага плана УВА № D21-070/вуч. 2013 г.

**Складальнікі**:

**Пракапчук Вольга Генрыхаўна**, загадчык кафедры класічнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Прыстаўка Ягор Уладзіміравіч**, дацэнт кафедры класічнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

Кафедрай класічнай філалогіі філалагічнага факультэта (пратакол № 4 ад 08.12.2017 г.)

Саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 4 ад 20.12.2017 г.).

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Антычныя метрыка і рыторыка» з’яўляецца неад’емным кампанентам філалагічнай адукацыі студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 05 Класічная філалогія і фарміруе іх прафесійныя кампетэнцыі.

Дысцыпліна «Антычныя метрыка і рыторыка» ўваходзіць у цыкл дысцыплін спецыялізацыі і кампанент установы вышэйшай адукацыі. Дысцыпліна «Антычныя метрыка і рыторыка» звязана з такімі дысцыплінамі, як «Гісторыя старажытнагрэчаскай літаратуры» «Гісторыя рымскай літаратуры», «Тэорыя літаратуры», «Рыторыка».

Веды па антычнай метрыцы і рыторыцы з’яўляюцца тым неабходным падмуркам, без якога не магчымае вывучэнне паэтычных твораў класікаў старажытнагрэчаскай і рымскай літаратуры. Акрамя таго, старажытнагрэчаская метрыка як навука аб законах будовы верша і вершаванай страфы глабальным чынам паўплывала на станаўленне сістэм вершаскладання шматлікіх еўрапеўскіх літаратур, а антычная рыторыка стала падмуркам для развіцця еўрапейскіх школ красамоўства.

Структурна вывучэнне дысцыпліны «Антычныя метрыка і рыторыка» складаецца з цыкла лекцый і цыкла практычных заняткаў. Практычныя заняткі нацэлены на фарміраванне навыкаў творчага аналізу паэтычнага і рытарычнага матэрыялу.

***Мэта*** дысцыпліны «Антычныя метрыка і рыторыка» – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі катэгорыямі і паняццямі антычнай метрыкі і рыторыкі і сфарміраваць навыкі метрычнага і рытарычнага аналізу тэксту.

***Задачы*** дысцыпліны:

- фарміраванне ўсвядомленага разумення студэнтамі аб месцы антычнай метрыкі і рыторыкі ў развіцці еўрапейскай і нацыянальнай культуры;
- авалоданне лінгвастылістычнай тэорыяй;
- авалоданне навыкамі метрычнага аналізу;
- набыццё ўстойлівых навыкаў самастойнага аналізу рытарычных і паэтычных тэкстаў.

Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне шэрагу акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, г. зн. спецыяліст павінен:

– умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач (АК-1);

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам (АК-2);

– валодаць даследчымі навыкамі (АК-3);

– умець працаваць самастойна (АК-4);

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем (АК-6);
– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця (АК-9);
– лагічна, аргументавана і ясна будаваць вуснае і пісьмовае маўленне, выкарыстоўваць навыкі публічнай прамовы, вядзення дыскусіі і палемікі (САК-7);
– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў (ПК-16);
– праводзіць даследаванні, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках (ПК-24).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

- змест асноўных рытарычных паняццяў;
- асноўныя метрычныя памеры і строфы, якія сустракаюцца ў антычнай літаратуры;

***умець:***

- карыстацца лінгвастылістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя памеры, строфы, тропы і фігуры;
- характарызаваць рытарычныя і паэтычныя тэксты з пункту погляду іх структуры і функцыі;
- вызначаць памер вершаванага радка, правільна расстаўляць іктусы і цэзуры.
- самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па метрыцы і рыторыцы;

***валодаць:***

- навыкамі метрычнага аналізу, чытання і інтэрпрэтацыі антычнай паэзіі.
- навыкамі аналізу рытарычных тэкстаў.

Пры вывучэнні дысцыпліны «Антычныя метрыка і рыторыка» рэкамендуецца выкарыстоўваць як традыцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, якія ўключаюць тлумачальна-ілюстрацыйны і рэпрадуктыўны метады навучання, так і інавацыйныя тэхналогіі, якія прадугледжваюць выкарыстанне найноўшых інфармацыйна-камунікатыўных сродкаў навучання.

Рэкамендаваны формы самастойнай работы студэнтаў: вывучэнне вучэбнай і даведачнай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне; чытанне і аналіз аўтарскіх тэкстаў; кансультацыі з выкладчыкам.

Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, якія адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з навучальным планам установы вышэйшай адукацыі, размеркаванне

аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсах і семестрах, формы бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне:

| | |
|---|---|
| Курс | I |
| Семестры | II |
| Агульная колькасць гадзін | 74 |
| Колькасць аўдыторных гадзін | 34 |
| • Лекцыі | 20 |
| • Практычныя заняткі | 10 |
| • КСР | 4 |
| Форма бягучай атэстацыі | Залік |

# II. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. АГУЛЬНЫЯ ПРАВІЛЫ АНТЫЧНАЙ ПРАСОДЫІ

Спецыфіка старажытнагрэчаскага і рымскага вершаскладання. Вучэнне аб прасодыі. Паняцце моры. Пазіцыйная і прыродная колькасць склада. Марфалагічныя падказкі для вызначэння колькасці склада ў старажытнагрэчаскай і лацінскай мовах. Працягласць і кароткасць суфіксаў і канчаткаў.

## Тэма 2. НАЙБОЛЬШ ВАЖНЫЯ ФАНЕТЫЧНЫЯ З’ЯВЫ Ў ПАЭТЫЧНЫМ РАДКУ. СТРУКТУРА АНТЫЧНАГА ВЕРША

Асноўныя фанетычныя з’явы ў антычных вершах. Элізія. Апакопа. Афэрэза. Сінэрэза. Дыястала. Сістала. Дыярэза. Эпентэза. Сінкопа. Тмэза (тмэсіс). Анастрафа. Этымалогія і сутнасць паняццяў.

Дэфініцыі паняццяў верш і стапа. Часткі стапы: арсіс, тэзіс. Віды стоп у залежнасці ад колькасці складоў: двухскладовыя, трохскладовыя і чатырохскладовыя.

Двускладовыя стопы: спандэй, пірыхій, харэй, ямб.

Трохскладовыя стопы: трыбрах, молас, дактыль, анапест, крэтык (амфімакр), бакхій, амфібрахій.

Чатырохскладовыя стопы: пракелеўсматык, іёнікі, антыспаст, пеаны, эпітрыты.

Разнавіднасці вершаў паводле колькасці стоп: дыподыя, трыподыя, тэтраподыя, пентаподыя, гексаподыя.

Каталектычныя і акаталектычныя вершы.

## Тэма 3. ДАКТЫЛІЧНЫ ГЕКЗАМЕТР. ЭЛЕГІЧНЫ ДВУВЕРШ

Дактылічны гекзаметр. Схема. Гісторыя і этымалогія паняцця.

Цэзура, яе разнавіднасці (букалічная, трахеічная і інш.). Дыярэза.

Схема элегічнага двувершу. Гарацый пра элегічны памер. Гісторыя і этымалогія паняцця. Старажытнагрэцкія і рымскія паэты, якія карысталіся элегічным вершам.

## Тэма 4. ЯМБІЧНЫЯ ВЕРШЫ. ХАРЭІЧНЫЯ ВЕРШЫ

Ямбічны трыметр. Асаблівасці і разнавіднасці. Жанры, якія складаліся ямбічным трыметрам. Сенар. Ямбічная страфа. Халіямб.

Трахеічны каталектычны тэтраметр. Структура і метрычная схема. Прасадычныя варыяцыі.

## Тэма 5. ХАРЫЯМБ І ВЕРШЫ НА ЯГО ПАДМУРКУ

Паняцце і метрычная схема харыямба.

Віды вершаў, створаных на падставе харыямба. Адоній. Ферэкратэй. Гліканей, яго разнавіднасці. Малы Асклепіядавы верш. Вялікі Асклепіядавы верш. Фалекейскі адзінаццаціскладовік. Алкееў дзесяціскладовік. Алкееў дзевяціскладовік. Алкееў адзінаццаціскладовік. Малы Сапфічны адзінаццаціскладовік. Вялікі Сапфічны верш. Арыстафанаў верш. Прыапейскі верш.

## Тэма 6. НАЙВАЖНЕЙШЫЯ СТРОФЫ АНТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ

Паняцце страфы.

Першая Архілохава страфа (Алкманійская страфа). Другая Архілохава страфа. Трэцяя Архілохава страфа. Першая Асклепіядава страфа. Другая Асклепіядава страфа (асклепіядава-гліканічная першая). Трэцяя Асклепіядава страфа (асклепіядава-гліканічная другая). Чацвертая Асклепіядава страфа (асклепіядава-гліканічная трэцяя). Алкеева страфа. Малая сапфічная страфа. Вялікая сапфічная страфа. Гіпанактава страфа.

## Тэма 7. ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ І АСНОЎНЫЯ ПОМНІКІ АНТЫЧНАЙ РЫТОРЫКІ

Станаўленне і развіццё антычнай рыторыкі. Асноўныя прадстаўнікі аратарскага майстэрства. Практычнае і тэарэтычнае красамоўства. Найбольш вядомыя помнікі грэчаскага практычнага красамоўства: у класічную эпоху (прамовы Горгія, Лісія, Ісакрата, Дэмасфена, Эсхіна; у эпоху «другой сафістыкі» (прамовы Дыёна Хрысастома, Элія Арыстыда). Рымскае практычнае красамоўства і яго прадстаўнікі. Помнікі тэарэтычнага красамоўства Грэцыі і Рыма.

## Тэма 8. КАМПАЗІЦЫЯ КЛАСІЧНАЙ РЫТОРЫКІ

Антычны рытарычны канон. Інвенцыя (inventio) як раздзел, у якім разглядалася працэдура адбору матэрыялу. Дыспазіцыя (dispositio) як раздзел, у якім распрацоўваліся пытанні разгортвання знойдзенага матэрыялу. Элакуцыя (elocutio) як раздзел, у якім распрацоўваліся пытанні аздаблення прамовы (каталагізацыя тропаў і фігур, ordo naturalis і ordo artificalis). Акцыя (actio) як раздзел, які адказваў за пластычная рашэнні (рытарычная прасодыя, пастава і жэсты прамоўцы). Мэморыя (memoria) як раздзел, які служыў распрацоўцы прыёмаў запамінання матэрыялу.

Ідэя пераканання (persuasio): логас (logos), этас (ethos), пафас (pathos).

## Тэма 9. АНТЫЧНАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ТРОПЫ І ФІГУРЫ

Месца элакуцыі ў складзе антычнай рыторыкі. Класіфікацыя фігур. Фігуры думкі: якія ўдакладняюць пазіцыю прамоўцы, якія ўдакладняюць

сэнс прадмета, якія ўдакладняюць стаўленне да прадмета, якія ўдакладняюць кантакт са слухачамі. Фігуры слова: фігуры прыбаўлення, фігуры ўбаўлення, фігуры перастаноўкі і размяшчэння; фігуры пераасэнсавання (тропы).

## Тэма 10. УПЛЫЎ АНТЫЧНАЙ РЫТОРЫКІ НА ФАРМІРАВАННЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ШКОЛЫ КРАСАМОЎСТВА

Візантыйская рыторыка як пераемніца грэчаскай рытарычнай традыцыі. Пазіцыі рыторыкі ў лацінскім Сярэднявеччы і новыя вобласці яе прымянення. Пазіцыі рыторыкі ў эпоху Адраджэння. Рыторыка ў эпоху Рэфармацыі і Контррэфармацыі. Энцыклапедычная і “афектыўная” рыторыка XVIII ст. Крызіс рыторыкі ў XIX ст. “Новая” рыторыка XX ст.

# III. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЕБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва раздзела, тэмы, занятку | Колькасць аўдыторных гадзін | | Коль-касць гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практыч. заняткі | | |
| 1 | **АНТЫЧНАЯ ПРАСОДЫЯ** | | | | |
| 1.1. | Вучэнне аб прасодыі. Паняцце моры. Пазіцыйная і прыродная колькасць склада. Прыродная працягласць грэцкіх і лацінскіх прыставак, суфіксаў і канчаткаў | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2 | **НАЙБОЛЬШ ВАЖНЫЯ ФАНЕТЫЧНЫЯ З’ЯВЫ Ў ПАЭТЫЧНЫМ РАДКУ. СТРУКТУРА АНТЫЧНАГА ВЕРША** | | | | |
| 2.1. | Фанетычныя з’явы ў антычных вершах | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 2.2. | Структура антычнага верша. Стапа і яе віды | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 3 | **АСНОЎНЫЯ ПАМЕРЫ АНТЫЧНАГА ВЕРШАСКЛАДАННЯ** | | | | |
| 3.1. | Дактылічны гекзаметр. Элегічны двуверш | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 3.2. | Гекзаметр у грэцкай паэзіі. Гекзаметр у рымскай паэзіі. Практыкаванні на пабудову гекзаметра | | 2 | | Пісьмовая работа |
| 3.3. | Ямбічныя вершы. Харэічныя вершы | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 3.4. | Харыямб і вершы на яго падмурку | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 3.5. | Вызначэнне метрычных памераў у старажытнагрэцкіх і рымскіх вершах | | 2 | | Пісьмовая работа |
| 4 | **НАЙВАЖНЕЙШЫЯ СТРОФЫ АНТЫЧНАЙ ПАЭЗІІ** | | | | |
| 4.1. | Архілохавыя і асклепіядавыя строфы. Алкеева, малая і вялікая сапфічныя строфы. Гіпанактава страфа | 2 | | | Вуснае апытанне |
| 4.2. | Дэкламацыя грэцкіх і лацінскіх вершаў | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 5 | **ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ І АСНОЎНЫЯ ПОМНІКІ АНТЫЧНАЙ РЫТОРЫКІ** | | | | |
| 5.1. | Станаўленне і развіццё антычнай рыторыкі. Асноўныя прадстаўнікі аратарскага майстэрства | 2 | 2 | | Вуснае апытанне |
| 5.2. | Помнікі практычнага і тэарэтычнага красамоўства Грэцыі і Рыма | | | 2 | Вуснае апытанне |
| 6 | **КАМПАЗІЦЫЯ КЛАСІЧНАЙ РЫТОРЫКІ. АНТЫЧНАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ТРОПЫ І ФІГУРЫ** | | | | |
| 6.1. | Антычны рытарычны канон. Ідэя пераканання (persuasio): логас (logos), этас (ethos), пафас (pathos) | 4 | | | Вуснае апытанне |

| № п/п | Назва раздзела, тэмы, занятку | Колькасць аўдыторных гадзін | | Коль-касць гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практыч. заняткі | | |
| 6.2. | Месца элакуцыі у складзе антычнай рыторыкі. Класіфікацыя фігур | | 2 | | Вуснае апытанне. Тэсты |
| **7** | **УПЛЫЎ АНТЫЧНАЙ РЫТОРЫКІ НА ФАРМІРАВАННЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ШКОЛЫ КРАСАМОЎСТВА** | | | | |
| 7.1 | Агляд гісторыі рыторыкі з Сярэднявечча да нашых дзён | | | 2 | Рэферат |
| | | **20** | **10** | **4** | |

# IV. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### *Асноная літаратура*


1. Альбрехт М. фон. История римской литературы от Андроника до Боэция и ее влияния на позднейшие эпохи / Пер. с нем. А. И. Любжина. Т. 1–3. М., 2002–2005.
2. Гаспаров М. Л. Античная риторика как система // Гаспаров М. Л. Об античной поэзии: Поэты. Поэтика. Риторика. СПб., 2000. С. 424–472.
3. Гаспаров М. Л. Очерк истории русского стиха. Метрика. Ритмика. Рифма. Строфика. М., 2000.
4. Зайцев А. И. Греческая метрика: Учебное пособие / Под ред. В. П. Смышляевой. СПб, 2010.
5. Кузнецов А. Е. Латинская метрика. Тула, 2006.
6. Козаржевский А. Ч. Античное ораторское искусство. Изд. 3. М., 2017.
7. Снелль Б. Греческая метрика = Griechische Metrik. М., 2002.
8. Цисык А. З., Шкурдюк И. А. Античная метрика. Мн., 2005.


### *Дадатковая літаратура*


1. Авеличев А. К. Возвращение риторики // Общая риторика: Пер. с фр. / Ж. Дюбуа, Ф. Пир, А. Тритон и др.; Общ. ред. и вступ. ст. А. К. Авеличева. М., 1986. С. 5–24.
2. Аверинцев С. С. Византийская риторика. Школьная норма литературного творчества в составе византийской культуры // Проблемы литературной теории в Византии и латинском средневековье / Отв. ред. М. Л. Гаспаров. М., 1986. С. 19–90.
3. Аверинцев С. С. Литературные теории в составе средневекового типа культуры: (Введение) // Проблемы литературной теории в Византии и латинском средневековье / Отв. ред. М. Л. Гаспаров. М., 1986. С. 5–18.
4. Аверинцев С. С. Риторика и истоки европейской литературной традиции. М., 1996.
5. Аверинцев С. С., Андреев М. Л., Гаспаров М. Л., Гринцер П. А., Михайлов А. В. Категории поэтики в смене литературных эпох // Историческая поэтика. Литературные эпохи и типы художественного сознания. М., 1994. С. 3–38.
6. Адамов Е.А. Выдающиеся ораторы древнего мира и средних веков. М., 1964.
7. Андреев М. Л. Итальянское возрождение: от стиля к жанру // Историческая поэтика. Литературные эпохи и типы художественного сознания. М., 1994. С. 297–325.
8. Античность и Византия. М., 1975.
9. Безменова Н. А. Очерки по теории и истории риторики. М., 1991.
10. Варзонин Ю. Н. Теоретические основы риторики. Тверь, 1998.

11.Гаспаров М. Л. Средневековые латинские поэтики в системе средневековой грамматики и риторики // Проблемы литературной теории в Византии и латинском средневековье / Отв. ред. М. Л. Гаспаров. М., 1986. С. 91–169.
12.Гаспаров М. Л. Цицерон и античная риторика: Вст. ст. // Цицерон. Три трактата об ораторском искусстве / Под ред. М.Л.Гаспарова. М., 1972. С. 7–73.
13.Гиндин С. И. Что знала риторика об устройстве текста? // Риторика. 1995. № 2, 3.
14.Гринцер П. А. Стиль как критерий ценности // Историческая поэтика. Литературные эпохи и типы художественного сознания. М., 1994. С. 160–222.
15.Исаева В.И. Античная Греция в зеркале риторики: Исократ. М., 1984.
16.Клюев Е. В. Риторика (Инвенция. Диспозиция. Элокуция). М., 1999.
17.Корнилова Е.Н. Риторика – искусство убеждать: Своеобразие публицистики античной эпохи: Учебное пособие. М., 1998.
18.Кузнецова Т.И. Техника повествования в ораторском искусстве // Поэтика древнеримской литературы. М., 1989.
19.Кузнецова Т. И., Стрельникова И. П. Ораторское искусство в древнем Риме. М., 1976.
20.Курбатов Г. Л. Риторика // Культура Византии IV–первая половина VII в. – М., 1984. С. 331–357.
21.Лапина М. С. Антитеза в периодической речи Исократа // Учен. зап. Харьк. ун-та. 1962. Т. CXVI. Тр. филол. ф-та. Т. 10. С. 272–286.
22.Лапина М. С. О композиции периодов у Исократа // Учен. зап. Харьк. ун-та. 1962. Т. CXVI: Тр. филол. ф-та. Т. 10. С. 256-271.
23.Лисовый И. А, Ревяко К. А. Античный мир в терминах, именах и названиях. Минск, 1996.
24.Лосев А. Ф. Античные теории стиля в их историко-эстетической значимости // Античные теории стиля. М., 1978. С.5–12.
25.Лосев А.Ф. История античной эстетики. Аристотель и поздняя классика. М., 1976.
26.Лосев А. Ф. История античной эстетики. Высокая классика. М., 1974.
27.Лосев А. Ф. История античной эстетики. Ранний эллинизм. М., 1979.
28.Лосев А. Ф. История античной эстетики. Софисты. Сократ. Платон. М., 1969.
29.Лотман Ю. М. Риторика // Уч. зап. Тартуского ун-та. Вып. 515. Труды по знаковым системам. 12. Структура и семиотика художественного текста. Тарту, 1981. С. 8–28.
30.Меликова-Толстая С. Античные теории художественной речи // Античные теории языка и стиля. СПб., 1996. С. 155–177.
31.Миллер Т. А. Аристотель и античная литературная теория // Аристотель и античная литература. М., 1978. С. 5–106.
32.Миллер Т. А. От поэзии к прозе (Риторическая проза Горгия и Исократа) // Античная поэтика. Риторическая теория и литературная практика. М., 1994. С. 60–105.

33. Мячкоўская Н. Б. Рыторыка ў культурах заходніх і ўсходніх славян. Тэндэнцыі развіцця ў XV-XVII стагоддзях. Мн., 1993. 35 с.
34. Неориторика: генезис, проблемы, перспективы: Сб. научно-аналитических обзоров. М., 1987.
35. Общая риторика: Пер. с фр. / Ж. Дюбуа, Ф. Пир, А. Тритон и др.; Общ. ред. и вступ. ст. А. К. Авеличева. М., 1986.
36. Радциг С. И. История древнегреческой литературы. М., 1969.
37. Рождественский Ю. В. Теория риторики. М., 1997.
38. Словарь античности. М., 1993.
39. Татаркевич В. Античная эстетика: [Пер. с польск.]. М., 1977.
40. Чистякова Н. А., Вулих Н. В. История античной литературы. М., 1972.

## *Крыніцы*

Античные риторики / Собр. текстов, ст., коммент. и общ. ред. А.А.Тахо-Годи. М., 1978.

Античные теории языка и стиля. М., Л., 1936.

Аристотель и античная литература. М., 1978.

Гермоген. Об идеях // Вопросы классической филологии. Вып. VIII, IX. М., 1984, 1987.

Демосфен. Речи / Пер. С.И. Радцига. М., 1954.

Демосфен. Речи: В 3 т. / Под ред. Е.С.Голубцовой, М.П.Маринович, Э.Л.Фролова. М., 1994.

Исократ. Речи // Вестник Древней Истории. 1965, №3. 1969, №1.

Квинтилиан. Двенадцать книг риторических наставлений / Пер. А. С. Никольского. СПб, 1834.

Лисий. Речи / Пер. С.И.Соболевского. М., 1933 (1994).

Ораторы Греции. М., 1985.

Памятники позднего античного ораторского и эпистолярного искусства. М., 1964.

Тацит. Диалог об ораторах // Тацит. Сочинения: В 2 т. Т.1. Л.,1969.

Цицерон. Избранные сочинения. М, 1975.

Цицерон. Речи: В 2 ч. М., 1962 (1993).

Цицерон. Три трактата об ораторском искусстве / Под ред. М.Л.Гаспарова. М., 1972.

## *Электронныя рэсурсы*

1. Антычная літаратура www.ancientrome.ru
2. Сайт кафедры класічнай філалогіі БДУ www.graecolatini.bsu.by.
3. Сайт студэнцкага навуковага тавырыства www.sno.pro1.ru

## ТЭМАТЫКА КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

### Тэма: «Помнікі практычнага і тэарэтычнага красамоўства Грэцыі і Рыма»

**Тэарэтычныя пытанні:**

1. Найбольш вядомыя помнікі грэчаскага практычнага красамоўства класічнай эпохі.
2. Найбольш вядомыя помнікі грэчаскага практычнага красамоўства эпохі «другой сафістыкі».
3. Рымскае практычнае красамоўства і яго прадстаўнікі.
4. Помнікі тэарэтычнага красамоўства Грэцыі.
5. Помнікі тэарэтычнага красамоўства Рыма.

**Практычныя заданні:**

1. Падрыхтуйце даклад на тэму «Прамовы Горгія».
2. Падрыхтуйце даклад на тэму «Прамовы Лісія».
3. Падрыхтуйце даклад на тэму «Прамовы Ісакрата».
4. Падрыхтуйце даклад на тэму «Прамовы Дэмасфена».
5. Падрыхтуйце даклад на тэму «Прамовы Эсхіна».

### Тэма: «Агляд гісторыі рыторыкі з Сярэднявечча да нашых дзен»

**Тэарэтычныя пытанні:**

1. Візантыйская рыторыка як пераемніца грэчаскай рытарычнай традыцыі.
2. Пазіцыі рыторыкі ў лацінскім Сярэднявеччы і новыя вобласці яе прымянення.
3. Пазіцыі рыторыкі ў эпоху Адраджэння.
4. Рыторыка ў эпоху Рэфармацыі і Контррэфармацыі.
5. Энцыклапедычная і "афектыўная" рыторыка XVIII ст.
6. Крызіс рыторыкі ў XIX ст. і "Новая" рыторыка XX ст.

**Практычныя заданні:**

1. Падрыхтуйце рэферат на тэму «Уплыў антычнай рытарычнай традыцыі на станаўленне і развіццё візантыйскай рыторыкі».
2. Падрыхтуйце рэферат на тэму «Лацінамоўныя рыторыкі Сярэднявечча».
3. Падрыхтуйце рэферат на тэму «Лацінамоўныя рыторыкі эпохі Адраджэння».

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Антычная метрыка і рыторыка » выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытанне падчас заняткаў;
- пісьмовыя работы;
- рэфераты;

- прамежкавыя формы атэстацыі (прамежкавы залік);
- выніковая форма атэстацыі (залік).

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЗАЛІКУ

***Тэарэтычныя пытанні***

1. Пазіцыйная і прыродная колькасць склада.
2. Асноўныя фанетычныя з’явы ў антычных вершах.
3. Стапа. Двухскладовыя, трохскладовыя і чатырохскладовыя стопы.
4. Дактылічны гекзаметр. Цэзура, яе разнавіднасці.
5. Элегічны двуверш.
6. Ямбічны трыметр. Сенар. Ямбічная страфа. Халіямб.
7. Харыямб і вершы на яго падмурку.
8. Найважнейшыя строфы антычнай паэзіі.
9. Зараджэнне і асноўныя этапы развіцця грэчаскай рытарычнай традыцыі, асноўныя прадстаўнікі.
10. Развіццё рыторыкі на рымскай глебе, асноўныя прадстаўнікі.
11. Асноўныя помнікі грэчаскага тэарэтычнага красамоўства.
12. Асноўныя помнікі рымскага тэарэтычнага красамоўства.
13. Жанры публічнай прамовы.
14. Антычны рытарычны канон: этапы параджэння прамовы. Ідэя пераканання (persuasio): логас (logos), этас (ethos), пафас (pathos).
15. Станаўленне візантыйскай рыторыкі.
16. Развіццё сярэднявечнай лацінамоўны рытарычнай традыцыі.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА КАНТРОЛІ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Выніковая адзнака па дысцыпліне фарміруецца на падставе трох дакументаў:

1. Правілы правядзення атэстацыі студэнтаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ад 29.05.2012 г.

2. Палажэнне аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ад 18.08.2015 г.

3. Крытэрыі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў па 10-бальнай шкале ад 22.12.2003 г.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
З ІНШЫМІ ДЫСЦПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне, якая вывучаецца | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. Гісторыя старажытнагрэчаскай літаратуры | Кафедра класічнай філалогіі | Няма зменаў | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 4 ад 08.12.2017 г. |
| 2. Гісторыя рымскай літаратуры | Кафедра класічнай філалогіі | Няма зменаў | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 4 ад 08.12.2017 г. |
| 3. Рыторыка | Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання | Няма зменаў | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 4 ад 08.12.2017 г. |
| 4. Тэорыя літаратуры | Кафедра тэорыі літаратуры | Няма зменаў | Змены не патрабуюцца. Пратакол № 4 ад 08.12.2017 г. |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
на _____/_____ вучэбны год

| № п п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол № _ ад ________ 20_ г.)

Загадчык кафедры

________________________ _________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

________________________ _________________ _____________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)